УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# М а т э р ы я л ы

**першага этапу (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па вучэбных прадметах</u>**
**<u>“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”</u>**
**для вучняў IX класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2016/2017 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2016

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Водгук на мастацкі твор**

**IX клас**

Анатоль Канапелька
Роднае слова

Адкрываю,
як свет,
нанова
беларускае
роднае слова,
пералівістае –
як каменьчык,
вясёлкавае –
як ручэй,
цёплае – як агеньчык
добрых тваіх вачэй,
светлае –
як маланка,
гнеўнае –
як пярун,
ціхае –
як калыханка,
вечнае –
як Беларусь!

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**
**IX клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Па асаблівасцях вымаўлення спалучэнняў зычных гукаў вызначце ў кожным радзе "лішняе " слова.

1. Змераць, знішчыць, згінуць, збіць.
2. Імкнешся, не парэжся, вучышся, расчэшаш.
3. Абклеіць, памагчы, лічба, падсадзіць.

*Максімальная колькасць балаў – 3*

**Заданне 2.** Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары і знакі прыпынку.

Кутком былога славянства забытай даўніны называю_ вучоныя Беларусь. Яе гаворка данесла ў найбольшай захаванас_ці рэшткі старажытнай мовы. У сувязі з гэтым асаблівай увагі заслугоўвае праблема запазыча__яў у стара_беларускай мове. У сучасным м__вазнаўстве ўсё больш і больш пашыраецца погляд што запазыча__е з__яўляецца н_ с_в_чаннем зан_паду мовы а наадварот пака_чыкам эвалюцыі адзнакай узрослых патрабава_яў да яе вынікам больш высокай ступені развіцця культурна_ палітычнай і грамадска_ гаспадарчай сфер жыцця.

*Максімальная колькасць балаў – 6*

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу.

| *Слова* | *Прыстаўка* | *Корань* | *Суфікс(ы)* | *Канчатак* |
|---|---|---|---|---|
| перасяленец | | | | |
| одум | | | | |
| мушка (вінтоўкі) | | | | |
| выкрутка | | | | |
| безліч | | | | |

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 4.** Выпішыце лішняе слова па прыкмеце матываванасці.

Навушнікі, завушніцы, падушка, вушанка, вушасты.
Вадкасць, правадыр, вадзіцель, важак, ваджэнне.
Агарод, гарадзіць, агароджа, загар, гарадок.
Радасць, узрадаваны, нарадзіцца, радасны, радавацца.
Варыць, повар, узвар, варвар, мульціварка.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 5.** Выпраўце памылкі ў тых прыкладах, дзе парушаны сінтаксічныя нормы беларускай мовы.

1) БДУ правяла ўступную кампанію - ________________________________
2) тры разгалістыя ліпы - ____________________________________________
3) паўбатальёна выканала - __________________________________________
4) доктар Філімонава рэкамендавала - ________________________________
5) дом на пяць павер хаў - ___________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 3*

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж падкрэсленымі ў сказах словамі і іх часцінамоўнай прыналежнасцю. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

| | |
|---|---|
| А) Не заўсёды ў мяне было сто рублёў, адн<u>ак</u> я заўжды меў надзейных сяброў. | 1) Прыслоўе |
| Б) Зімовы вечар надыходзіць хутка, адразу пасля паўдня. | 2) Часціца |
| В) Рабінка, якая расце каля майго акна, у непагоду стукае галінкамі ў шыбу, нібы просіць схаваць яе ад золкіх вятроў. | 3) Займеннік |
| Г) Куды вецер, туды і дым. | 4) Злучнік |
| Д) Дамоў я ішоў падскокваючы. | 5) Прыназоўнік |
| | 6) Дзеепрыслоўе |

Адказ ________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 7.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх сінтаксічнай роляй у сказах.

| | |
|---|---|
| А) Вучні былі на сёмым небе ад шчасця. | 1) азначэнне |
| Б) Неба дзень пры дні было зацягнута хмарамі. | 2) акалічнасць |
| В) За рэчкай было поле як ахапіць вокам. | 3) дапаўненне |
| Г) У Язэпа крыху адлягло ад сэрца. | 4) дзейнік |
| Д) Жыццё юнацкае злажыў ён на алтар радзімы. | 5) выказнік |

Адказ ________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 8.** Назавіце аўтараў і жанр указаных твораў.

| **Назва твора** | **Аўтар** | **Жанр** |
|---|---|---|
| "Меч князя Вячкі" | | |
| "Жуль Верн" | | |
| "Шануйце роднае слова!" | | |
| "Ганарысты Парсюк" | | |
| "Магіла льва" | | |
| "Паўлінка" | | |

*Максімальная колькасць балаў – 6;*
*0,5 бала – за прозвішча аўтара ;*
*0,5 бала – за правільнае вызначэнне жанру*

**Заданне 9.** Прачытайце верш Міколы Сурначова і вызначце радкі, у якіх вучань пры перапісванні не даставіў знакаў прыпынку. Устаўце адпаведныя знакі. Запішыце справа, як называюцца выдзеленыя тропы.

| | |
|---|---|
| Ты мне патрэбна як глебе вада, | |
| Як мараку пах **салёнага мора** | |
| Клікнуць? – Не змогуць вятры перадаць; | |
| Плакаць наўзрыд? – | |
| Прад бярозамі сорам; | |
| Казку  прыдумваць? – Не выйдзе на лад. | |
| Песню складаць? – Не складаецца песня. | |
| Сон **бы рукою** з павекаў зняла, – | |
| Мусіў я ночы прастойваць ля весніц | |
| Думаў | |
| **Цяжкая дарога** баёў | |
| **Казку** юнацкага **сэрца** прыглушыць, | |
| Можа яе каля родных гаёў | |
| Куля праніжа ці бомба прыдушыць. | |
| **Думкі плывуць і плывуць валакном** | |
| Зноўку туды ў маю родную вёску, – | |
| Бразне галінкай бярозка ў акно, | |
| Як на цябе  я гляджу на бярозку. | |

*Максімальная колькасць балаў – 6*

**Заданне 10.** Запоўніце табліцу, упісаўшы адпаведных аўтара, твор ці героя

| **Аўтар** | **Твор** | **Герой** |
|---|---|---|
| 1. Янка Купала | | Машэка |
| 2. | “Паром на бурнай рацэ” | |
| 3. | | Глечык |
| 4. Віктар Карамазаў | | Сцяпан |
| 5. | | Адольф Быкоўскі |
| 6. | | Мульцік |
| 7. | “Сірочы хлеб” | |

*Максімальная колькасць балаў – 6*

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Тэмы вусных выказванняў**
**IX клас**

**Білет 1**

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
   Ты – праўда непрыступнай вежы.
   *Леанід Галубовіч*

2. Магутнае слова ты, роднае слова!
   *Янка Купала*

**Білет 2**

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Кахаю… люблю…
   Беларускаму краю
   Бясконца я слова «люблю» паўтараю.
   *Данута Бічэль*

**Білет 3**

1. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.
   *Максім Танк*

2. Трэба дома бываць часцей…
   *Рыгор Барадулін*

**Білет 4**

1. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам…
   *Максім Багдановіч*

2. А мова матчына пявучая!
   Густая, нібы мёд, іскрыстая, як сонца!
   *Эдуард Валасевіч*

**Білет 5**

1. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
   Не скуеш толькі дум ланцугамі.
   *Янка Купала*

2. Прапрадзедаў маіх жывая мова –
   Майго народа першая аснова,
   Душы яго шырокі, чысты свет!
   *Еўдакія Лось*

**Білет 6**

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Ад прадзедаў спакон вякоў
   Мне засталася спадчына...
   *Янка Купала*

**Білет 7**

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…
   *Пятрусь Броўка*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

**Білет 8**

1. Бо як ёсць у народа такія –
   Не загіне давеку народ.
   *Уладзімір Караткевіч*

2. Самы светлы талент – дабрата.
   *Сяргей Грахоўскі*

**Білет 9**

1. Мая любімая казка.

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!
   *Генадзь Бураўкін*

**Білет 10**

1. Архітэктурныя помнікі Беларусі.

2. Мова – душа народа.

**Білет 11**

1. Я родам з Адраджэння. Ды цяпер
   Усім часам, прасторам я належу.
   *Мікола Арочка*

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!
   *Васіль Жуковіч*

**Білет 12**

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Вочы маці!
   У доўгія зімнія ночы
   Вы над намі
   Вясёлымі зоркамі ззялі…
   *Ніл Гілевіч*

**Білет 13**

1. Святлана Алексіевіч — першы нобелеўскі лаўрэат з Беларусі…

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.
*Сымон Будны*

**Білет 14**

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.
*Цётка*

**Білет 15**

1. Біблія – дзівосная рака…
*Францішак Скарына*

2. Чалавек – гэта цэлы свет.
*Кузьма Чорны*

**Білет 16**

1. Мае бацькі – мае настаўнікі ў жыцці.

2. Песня – душа народа.
*Рыгор Шырма*

**Білет 17**

1. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.
*Ян Баршчэўскі*

2. Прырода – найцікавейшая кніга.
*Якуб Колас*

**Білет 18**

1. Свет нас прымаў як народ
Па адной палачанцы.
*Данута Бічэль*

2. Чалавеку патрэбна не слава…
*Сяргей Грахоўскі*

**Білет 19**

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…
*Анатоль Вярцінскі*

**Білет 20**

1. Унукі Скарыны,
   Дзе ваш гонар, моц і краса?
   Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.
   Не давайце святыні псам!

   *Уладзімір Караткевіч*

2. Нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны.

   *Васіль Быкаў*